# СІСТЭМА ВОБРАЗНА-ВЫЯЎЛЕНЧЫХ СРОДКАЎ У "ПЕСНІ ПРА ЗУБРА" М.ГУСОЎСКАГА

**Я.У. Чарпухіна**

Пафаснасць "Песні пра зубра" – пафаснасць драматызацыі малюнкаў і афектацыі маналогаў. Майстэрскае выкарыстанне паэтычных дэталяў, эпітэтаў, параўнанняў, метафар, на аснове рэнесансна-рэалістычнага адлюстравання. Анталагічная традыцыя ў творы: адраджэнне канкрэтнага, пластычнага апісання. як у паэзіі Сапфо, Гарацыя, Катула, Авідзія. [1, 253]

Аснова вобразнасці паэмы – зрокавы эпітэт, які дазваляе чытачу праз прызму бачання аўтара непасрэдна ацэньваць падзеі. Рэалізацыя "зрокавасці" ў перакладзе Я.Семяжона і прынцып рэнесанснага натуралізму: "магутны, прысадзісты волат", "сціжма людзей незлічоная", "з сівым касмыллем", "пысай храпастай", "конь растрыбушаны". Выкарыстанне эпітэтаў дазваляе паэту ў поўным аб'ёме раскрыць каляровую і гукавую палітру твора: "мілагучнасцю строгай", "шум у вершавінах, і шоргат", "у жаўталістай пушчы", "ачэрнены кончык", "бялюткай пасцелі", "у барвовай накідцы". Роля эпітэтаў у вылучэнні і апісанні істотных індывідуальных рыс чалавека ці з'явы прыроднага асяроддзя. Эмацыянальнае і экспрэсіўнае ўспрыманне аўтарам навакольнай рэчаіснасці: "пёрка нязвыклае", "думкай быстракрылай", "спрыт



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

забіяцкі", "аудавелая матка", "шчодрая вільгаць". Побытава-народныя эпітэты ў мастацкай тканіне "Песні...": "спорным дажджом", "поле ўрадлівае", "сталь булатная", "шабляй бліскучаю". Рэлігійныя эпітэты як асобны пласт вобразнасці твора: "папскі прастол", "хрысціян міралюбных", "міласэрная уцешніца", "грахоў сваіх цяжкіх", "раб твой пакорлівы". Закон ліра-эпічнага жанру. Індывідуальна-аўтарскія і агульнамоўныя [класічныя] сродкі вобразнай арганізацыі паэмы: "часовы абраннік", "боль невыносны", "свету жывёльнага", "славай недобрай ахрышчоны", "твор дасканалы".

Параўнанні як прыклад жывога народнага слова, шматвяковай мудрасці: "часта ж раўняюць малое з вялікім, як быка з індыкам", "лясы, нібы хмара", "масці паджарай, як мешанка бурай і чорнай".

Метафара – актыўны сродак аўтарскага тлумачэння свету. Своеасаблівая выява ўнутранага эмацыянальнага стану творцы, яго мастацкага густу і асноўнай канцэпцыі творчасці. Непасрэднае пазнанне прыроды – надзейная зброя ў дасягненні ісціны. Рэнесансна-натуралістычны метад пабудовы паэтычнай сістэмы твора: "крыніца натхнення", "ярасць кіпіць", "злосцю клякоча нутро", "лодка жыццёвая", "снег счырванее".

Метафарызацыя кантэкста як метад уздзеяння на эстэтычную падсвядомасць чытача:

Свет хрысціянства з яго хрысціянскаю верай
Трэснуў даўно, і расколіна ўглыб пранікае... [2, 115]

Ідэалізацыя магутнасці прыроднай стыхіі і гіпербалізацыя вобраза зубра: "трох паляўнічых садзіцца ў яго між рагамі", "зубр велізарны, скрываўлены", "пятнаццаць лаўцоў на начлезе спалі на шкуры забітага волата-зубра", "быў запрыкмечаны зубр, можа, дзвесцегадовы".

Дакладнасць і пластыка паэтычнай мовы твора. Глыбінная сутнасць слова як дамінанта аўтарскай мастацкай арганізацыі твора. Збліжэнне і ўзаемадзеянне гуманістычна-рэалістычных і рэлігійна-міфалагічных элементаў вобразнасці. Надыход новага этапу ў развіцці і станаўленні усходнееўрапейскай літаратуры. Лепшыя мастацка-эстэтычныя здабыткі лаціна-раманскай і грэка-візантыйскай культурных традыцый у сістэме паўночна-рэнесанснага прыгожага пісьменства як прыклад духоўнага ўзаемадзеяння Усходу і Захаду.

1. Лойка А. А. Старабеларуская літаратура. – Мн., 2001.
2. Гусоўскі М. Песня пра зубра: На лацінскай, беларускай, рускай мовах. – Мн., 1980.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ